***Буракова М.У.***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай і замежных моў*
*Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В. Сухога*
***Шведава З.У.***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры беларускай мовы*
*Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ІНФАГРАФІКІ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

***Анатацыя***. *Артыкул прысвечаны пытанню аб пашырэнні інфаграфікі як аднаго з сучасных метадаў візуалізацыі вучэбнага матэрыялу ў працэсе навучання студэнтаў увогуле і ў прыватнасці па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Вылучаюцца і аналізуюцца асноўныя тыпы інфаграфікі (статычная, інтэрактыўная, відэаграфіка) і розныя формы работы з інфаграфікай (гатовая, падрыхтаваная студэнтам ці групай).*

***Ключавыя словы:*** *інфаграфіка, візуалізацыя, тыпы інфаграфікі, вучэбны працэс, кампетэнтнасць.*

***Burakova M., Shvedova Z. Using Infographics in Belarusian Language Classes (Professional Vocabulary).*** *The article is devoted to the issue of the dissemination of infographics as one of the modern methods of visualization of educational materials in the process of teaching students in general and in particular in the discipline "Belarusian language (professional vocabulary)". The main types of infographics (static, interactive, video graphics) and various forms of infographics (ready-made, prepared by a student or group) are highlighted and analyzed.*

***Key words:*** *infographics, visualization, types of infographics, curriculum, competence.*

Сучасная інфармацыйная прастора знаходзіцца ў пастаяннай дынаміцы і характарызуецца бесперапынным павелічэннем аб’ёму дадзеных, якія спажываюцца грамадствам. У сувязі з развіццём інфармацыйных тэналогій у цяперашні час аб’ём інфармацыі павялічваецца так хутка, што традыцыйныя метады апрацоўкі становяцца не эфектыўнымі. Сучасны чалавек павінен хутка арыентавацца ў інфармацыі, аналізаваць і эфектыўна выкарыстоўваць яе ў прафесійнай дзейнасці.

Важным элементам сучаснай камунікацыі стала інфаграфіка, якая атрымала шырокае распаўсюджванне ў розных сферах жыцця грамадства. Інфаграфіка прадстаўляе сінтэз вербальных і невербальных кампанентаў, якія даступна і лаканічна перадаюць вялікі аб'ём дадзеных. М. Смікіклас пад дадзеным тэрмінам разумее візуалізацыю дадзеных або паняццяў, мэта якой – прадставіць аўдыторыі складаную інфармацыю так, каб яна магла быць хутка ўспрынятай і лёгка зразумелай [1, с. 12]. Такі від нагляднасці, ці інфаграфіка, выходзіць за межы простай ілюстрацыі. Гэта сінтэтычная форма арганізацыі інфармацыі, якая выкарыстоўваецца для дакладнай і аператыўнай перадачы вербальнай інфармацыі з мадэляваннем звязаных з ёй візуальных вобразаў. Яна працуе там, дзе трэба паказаць прыклады і алгарытм іх працы, суадносіны прадметаў і фактаў у часе і прасторы, прадэманстраваць, як што выглядае, названае адпаведным тэрмінам.

У апошні час інфаграфіка стала папулярнай і ў адукацыйнай прасторы. Візуальнае прадстаўленне складанай вучэбнай інфармацыі выразна, дакладна, эстэтычна і прывабна становіцца патрабаваннем. Для паспяховага выкладання дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)», якая накіравана на прафесійнае прымяненне беларускай навуковай тэрміналогіі і выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць спецыяльную інфармацыю на беларускай мове, неабходна прымяняць інавацыйныя метады арганізацыі вучэбнага працэсу.

Візуалізацыя, у прыватнасці інфаграфіка, пры навучанні на занятках па дысцыпліне дазваляе стварыць умовы для пачуццёвага ўспрымання інфармацыі. Яна павялічвае эфектыўнасць навучання, дапамагае асэнсавана засвоіць моўныя элементы, а таксама зрабіць гэта з вялікай цікавасцю.

На дадзены момант значэнне інфаграфікі бачыцца ў тым, што яна развівае кагнітыўную актыўнасць навучэнцаў, абуджаючы ў іх цікавасць да заняткаў увогуле і мовы ў прыватнасці, а таксама пашыраючы аб'ём вучэбнага матэрыялу. Акрамя таго, яна дазваляе зніжаць стомленасць, развіць творчае ўяўленне, мабілізаваць сілу волі і палегчыць увесь працэс навучання ў цэлым.

Інфаграфіка як візуальны тэкст наглядна адлюстроўвае суадносіны лічбавых і фізічных велічынь, арганізацыю і будову чаго-небудзь, суадносіны прадметаў і фактаў у часе і прасторы. Наглядная інфармацыя ўспрымаецца значна лягчэй, чым грувасткія тэксты. Яна хутчэй счытваецца, таму інфаграфіку выкарыстоўваюць для прадстаўлення інфармацыі любога тыпу: адукацыйнай, навуковай, займальнай. Мэтамі інфаграфікі з'яўляюцца:

- паказаць змяненне з цягам часу;
- параўнаць дзве ці больш з'явы;

- паказаць сувязі;
- зрабіць акцэнт на самым галоўным;
- структураваць вялікую колькасць інфармацыі і інш.

Інфаграфіка ўключае ў сябе фільтр інфармацыі, усталяванне ўзаемасувязі і іерархіі паміж элементамі, падзел прыкладаў па адрозненні, а таксама арганізацыю іх такім чынам, каб увага акцэнтавалася на самым галоўным.

На сучасным этапе вылучаюць тры тыпы інфаграфікі:

1) статычная (адзінкавы слайд без анімаваных элементаў);

2) інтэрактыўная (наяўнасць анімаваных элементаў, карыстальнікі могуць узаемадзейнічаць з дынамічнымі дадзенымі);

3) відэаграфіка (сціслы відэарад, у якім спалучаюцца візуальныя вобразы дадзеных, ілюстрацыі і дынамічны тэкст).

У навучальным працэсе найбольш распаўсюджаная статычная інфаграфіка.

Сучаснымі метадыстамі вылучаюцца два падыходы працы з інфаграфікай у навучальным працэсе. Першы з падыходаў прадстаўляе інфаграфіку, якая ствараецца выкладчыкам для вырашэння вучэбных задач, у першую чаргу, для прыцягнення ўвагі студэнтаў да тэмы. Як правіла, праца з гатовай інфаграфікай на занятках характэрна для этапу тэкставай дзейнасці студэнтаў. Другі варыянт стварае студэнт пасля самастойнага даследавання тэмы, аналізуе матэрыял, вылучае акцэнты і стварае інфаграфіку самастойна. Праца з інфаграфікай спрыяе больш дакладнаму вывучэнню матэрыялу, развівае крытычнае мысленне. Такі від работы з інфаграфікай можна аднесці да этапу паслятэкставай дзейнасці студэнта.

Трэці варыянт – калектыўная праца з інфаграфікай. Ужываючы калектыўны падыход працы з інфаграфікай, у студэнтаў выпрацоўваюцца ўменні працы ў камандзе (мікрагрупе), развіваюцца асобасныя, рэгулятыўныя і камунікатыўныя навыкі.

Трэба адзначыць, што актыўны ўдзел студэнтаў у стварэнні інфаграфікі і навучанне аналізу яе зместу дапамагае больш эфектыўнаму фарміраванню ў навучэнцаў іх візуальных вобразаў, з чым і звязана ў першую чаргу мэта выкарыстання візуалізацыі ў навучальным працэсе. Зварот да выкарыстання інфаграфікі ў адукацыйным працэсе прымушае звяртаць увагу на працэс яе стварэння, які праходзіць наступныя этапы:

1) фармуляванне мэты стварэння інфаграфікі;

2) збор матэрыялу па тэме, які можа быць прадстаўлены ў розных фарматах (тэкст, графіка, табліцы і інш.);

3) аналітыка, апрацоўка інфармацыі і прывядзенне яе да адзінага стылю;

4) пабудова даступнай візуалізацыі, вёрстка ў адным з магчымых фарматаў у залежнасці ад мэт і колькасці дадзеных.

Выкарыстанне інфаграфікі як сродку візуалізацыі навуковай і вучэбнай інфармацыі на занятках па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» вырашае праблему цяжкасці пераўтварэння зыходнай формы навучальнага матэрыялу ў наглядна сімвалічную, што дазваляе інтэнсіфікаваць і аптымізаваць навучальны працэс. Ва ўмовах сучаснага адукацыйнага працэсу сродкі нагляднага навучання павінны дазваляць навучэнцам супастаўляць, ўсталёўваць узаемасувязі, абагульняць разнастайныя веды, атрыманыя на занятках і ў ходзе самастойнай работы па агульнапрафесійных і прафесійна-кваліфікацыйных дысцыплінах.

Такім чынам, выкарыстанне інфаграфікі ў працэсе навучання студэнтаў вышэйшай школы дазволіць адукацыйнай установе рыхтаваць высокападрыхтаванага і кампетэнтнага спецыяліста ў пэўнай галіне прафесійнай дзейнасці.

*Літаратура*

1. Смикиклас М. Инфографика. Коммуникация и влияние при помощи изображений. СПб. : Питер, 2014. 152 с.

***Видиш С.В.***
*здобувачка вищої освіти*
*Східноукраїнський національний університет*
*імені Володимира Даля*

## КОЛОРАТИВНА ЛЕКСИКА В ПОЕЗІЯХ ГАЛИНИ ПОТОПЛЯК

***Анотація**. Розвідка присвячена дослідженню колоративів у поезіях Галини Потопляк. Лексика на позначення кольору має великі експресивні можливості. Відповідно до авторської інтерпретації, кольороназви набувають різноманітного смислу, завдяки чому зростає їхня роль у передачі інформації.*

***Ключові слова:*** *колір, колоратив, кольороназва, колористика, лексема.*